РУП «Белтэлекам» – афіцыйны партнёр «Славянскага базару ў Віцебску»

З 9 па 18 ліпеня 2018 года праходзіць XXVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

РУП «Белтэлекам» традыцыйна выступае афіцыйным партнёрам мерапрыемства і ў рамках партнёрства з фестывалем у 2018 годзе аказвае тэхнічную падтрымку, арганізуе працу зон Wi-Fi, праводзіць іміджавыя мерапрыемствы.

Музычны форум аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных народаў і краін, а «Белтэлекам» дапамагае заставацца на сувязі, увасабляючы ў жыццё свой дэвіз «На сувязі са светам».

У гэтым годзе ў фестывалі прымаюць удзел прадстаўнікі з 41 краіны свету. На фестывальных пляцоўках адбудзецца больш за 150 мерапрыемстваў. Асаблівую ўвагу прыцягваюць XXVII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск 2018» і XVI Міжнародны дзіцячы музычны конкурс.

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/13-07-2018-3320*